УДК 82.0

# УМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ ЧЫТАЦКАЙ САМАСТОЙНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКУ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

***Н. А. Гаравікова*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. А. Карпечкіна,***
канд. філал. навук, дацэнт

Фарміраванне чытацкай самастойнасці малодшых школьнікаў з'яўляецца адной з прыярытэтных задач пачатковай адукацыі. Чытанне адыгрывае ключавую ролю ў адукацыі, выхаванні і развіцці асобы, фарміруючы не толькі маўленчыя і разумовыя навыкі, але і здольнасць да самастойнага пазнання свету. Дадзены працэс патрабуе сістэматычнай і мэтанакіраванай працы з боку настаўнікаў і бацькоў.

Розныя аўтары трактуюць паняцце «чытацкая самастойнасць» па-рознаму. Так, К. Д. Ушынскі вызначае яе як здольнасць зразумець і прачуць твор, Н. Святлоўская – як уменне эфектыўна знаходзіць і выкарыстоўваць патрэбную інфармацыю ў кнігах, А. Г. Навумчук – як здольнасць карыстацца кнігай як крыніцай ведаў [2, с. 65]. Такім чынам, чытацкая самастойнасць ахоплівае каштоўнаснае стаўленне да чытання, валоданне рознымі чытацкімі дзеяннямі і выпрацоўку патрэбы ў самастойным чытанні.

Фарміраванне чытацкай самастойнасці праходзіць у некалькі этапаў: падрыхтоўчы, асноўны і заключны. Такі падыход дазваляе паступова развіваць у дзяцей здольнасць да самастойнага чытання і асэнсаванага ўспрымання тэкстаў. Псіхолага-педагагічныя асаблівасці малодшых школьнікаў таксама аказваюць уплыў на развіццё чытацкай самастойнасці. Важную ролю адыгрывае псіхалагічная гатоўнасць да чытання, узроставыя асаблівасці пазнавальнай дзейнасці, матывацыя і ўплыў сацыяльнага асяроддзя [1, с. 52]. Такім чынам, развіццё чытацкай самастойнасці патрабуе комплекснага падыходу, які ўключае працу з кнігамі на ўроках, стварэнне ўмоў для самастойнага чытання і фарміраванне ўстойлівай цікавасці да літаратуры.

**Літаратура**

1. **Выготский, Л. С.** Психология развития ребенка / Л. С. Выготский. – М. : Изд-во ЭКСМО, – 2004. – 512 с.
2. **Светловская, Н. Н**. Как помочь детям, которые не хотят учиться читать / Н. Н. Светловская, Т. С. Пиче-Оол. – М. : Аркти, 2007. – 54 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова